УДК 39

# ЛЯЛЬКІ-АБЯРЭГІ НА БЕЛАРУСІ: ВІДЫ, ЗНАЧЭННЕ, АСАБЛІВАСЦІ

*Д. Д. Чацвёркіна, А. М. Кукрэш*
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», Мінск (Рэспубліка Беларусь)*

# TALISMAN DOLLS IN BELARUS: TYPES, MEANING, CHARACTERISTICS

*D. D. Chatsverkina, A. M. Kukrash*
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank Minsk (Republic of Belarus)*

Анатацыя. У дадзенным артыкуле даследуюцца лялькі-абярэгі, характэрныя для беларускай культуры, іх віды, значэнне, асаблівасці і выкарыстанне ў розныя часы.

*Abstract*. This article examines charm dolls characteristic of Belarusian culture, their types, meaning, features and use at different times.

Ключавыя словы: беларускія традыцыі; лялькі-абярэгі; лялькі-матанкі; сямейныя традыцыі; выкарыстанне лялек-абярэгаў.

*Keywords*: Belarusian traditions; talisman dolls; matanka dolls; family traditions; use of talisman dolls.

Наш беларускі народ мае моцныя карані і традыцыі. Адной з іх з’яўляюцца лялькі з тканіны, яны ў розных месцах называюцца па рознаму: “матанкі”, “самаробныя лялькі”, “лялькі-абярэгі”. Крыніцы народных лялек налічваюць тысячагодддзі і вядуцца яшчэ з часоў язычніцтва. Лялькі – “гэта сімвалы нашай матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія служаць яркім узорам у справе выхавання нацыянальнага густу, нашай этычнай і эстэтычнай напоўненасці” [1, с. 7]. Паводле характару і прызначэння, як піша даследчык Я.М.Сахута, лялькі падзяляюцца на “абрадавыя, абярэгавыя, гульнявыя, тэатральныя, сувенірныя, этнаграфічныя, гістарычныя, аўтарскія і іншыя” [2, с. 197].

Лялька-матанка адказвала кожная за пэўную жыццёвую ситуацыю, выраблялася з тканіны, звычайна ношанай і “шчаслівай” (у якой чалавек адчуваў сябе шчаслівым), каб надаць абярэгу яшчэ больш моцную абарончую сілу. Тканіна павінна быць натуральнай і рвацца наласкуты рукамі без выкарыстання нажніц. Ніткі, якімі звязваецца лялька, таксама рваліся, а рэшткі павінны быць замотаны пэўную колькасць разоў і па правілах (наматвалася нітка па часавой стрэлцы), на кожны завязаны вузельчык шапталася добрае слова ці пажаданне. Іголкі нельга было выкарыстоўваць, як і ўсе астатнія колючыя сродкі. Па-правілах лялька-матанка рабілася без выявы твару. Лічылася, што праз вочы лялькі можна перадаць негатыў, ці нават ёй можа авалодаць злы дух і зрабіць дрэнна астатнім.

Чалавек, які збіраецца рабіць такую ляльку, павінен быць сам у добрым настроі, з станоўчымі думкамі і павагай і пажаданнем толькі лепшага таму, каму робіцца лялька.


*Мал. 1. Лялькі-матанкі*

Лялькі-матанкі суправаджалі чалавека ўсё яго жыцце, і рабілі іх менавіта жанчыны, “не залежачыя ад узроста, сацыяльнага статуса, матэрыяльнага становішча, стану здароўя і нацыянальнасці” [3, с. 4], для абярэга сябе, сваёй сям’і і хаты ці хлеву. Рабіць лялку-матанку трэба было за адзін дзень, не пакідаючы справу на заўтра, не ў святы і выходныя (пятніца, субота, нядзеля), не ноччу і пачынаць з галавы. Абавязкова на каленях ці падоле, лічылася, што гэта павялічвае ўздзеянне.

Вядомы фалькларыст, даследчык Уладзімір Васілевіч дае тлумачэнне: “Абярэгі, апатрапеі (ад грэч. Apotropaios тое, што адводзіць бяду), прадметы, выявы, або дзеянні, якім прыпісвалі магічную здольнасць засцерагаць ад няшчасцяў і ад злых духаў” [4, с. 29].


Мал. 2. Лялькі-абярэгі

Лялькі-абярэгі для дома былі вельмі папулярны сярод жыхароў і гарантавалі дабрабыт, дастатак і спакой у доме: Баба-Яга (рабілі з ільняной часанай паклі, непрыбранай прычоскай, лічылася, што яна палохае нячыстую сілу ці сябруе з ёй), Дзень і ноч (аднолькавыя лялькі, прывязаныя адзін да адной, але рознага колеру – белая, што адказвала за дзень, і чорная – ноч).

Уладар дома наперад выводзіў то адну, то другую, у залежнасці ад часу сутак: “Дзень і ноч”, “Душа дома” (лялька апраналяся ў нацыянальны строй і берагла гаспадыню), “Вокны радасці” (ромб з драўляных ветак упрыгожаны птушкамі і лентамі); для матэрыяльных поспехаў і дабрабыту: “Вепская лялька”, “Каза”, “Крупенічка”; лялькі для забаў: “Лялька на лыжцы” (пасля ежы лыжка абмотвалася кавалкам тканіны і дзіця забаўлялася), “Зайчык на пальчык” (лялька ў выглядзе зайца, якую можна было адзець на палец і гуляцца), “Кулачнік” (лялька на палачцы з ушытымі замест кулакоў каменчыкамі).


*Мал. 3. Лялькі для дзяўчат*

Выраблялі лялькі для дзяўчат: “Вяснянка”, “На шчасце”, каб прывабіць хлопцаў і асабістае шчасце; на замужжа “Сталбушка” – рабілася з жаночых парод дрэў (ліпа, рабіна, бяроза), няцотная колькасць варатнікоў, рознага колеру, якім надавалася рыса будучага мужа.


*Мал. 4. “Лялькі-неразлучнікі”*

“Неразлучнікі” – лялька павінна быць у кожным доме, лялькі-выявы мужчыны і жанчыны, трымаліся неразрыўна за рукі, ствараючы нібыта адну руку, якая рабілася з веткі слівы, сімвала вясны, чысціні, брака, шчасця і агульнай долі, інтарэсаў і поглядаў. Гэтыя лялькі вешалі пад дугой коней, якія везлі маладых браць шлюб.

“Міравое дрэва” – лялькі, якія ўпрыгожвалі вясельны каравай (бралася раздвоеная ветка-рагаціна, на адной рабілася лялька жаніха, на другой – невесты, агульная ветка-нага сімвалізавала адзінства сям’і, аб’яднанне двух розных родаў).

Калі сямья пачынала сваё жыццё, то заўсёды хацелася хутчэй дачакацца дзетак, але не заўсёды адразу ўсё атрымлівалася. На дапамогу звалі сястру, кросную маці ці бабулю з пажаданнем цяжарнасці і лёгкага хаджэння. Яны і рабілі “Ляльку на цяжарнасць” ці “Талстушку-кастрамушку” – дародную бабу з вялікімі грудзямі, маглі прывязваць да лялькі запеленанае дзіця, зробленае з ветачкі ці зматанае з ласкутоў. І ўсё атрымлівалася.

“Кувадка” – сваю назву атрымала ад абрада “Кувада”, які рабілі падчас родаў, каб аблегчыць і паскорыць нараджэнне дзіцяці.

Самая першая “Лялька-Пеленашка” рабілася вельмі проста: жанчына замотвала драўлянае паленца, нібыта пеленала, пакідаючы вольным тварык, паверху крыжом трымалі тканіну чырвоныя ніткі. "Пеленашку” падкладвалі ў калыску і казалі: “Не іграй маім дзіцятком, а іграй этой кукалкай” [3, с. 62]. Лічылася нават, што госці, якія прыходзілі паглядзець на дзіця, павінны былі рабіць кампліменты толькі “Пеленашцы”, каб не сурочыць немаўлятка. Калі дзіця

вырастала і пераходзіла ў большы ложак, рабілі такую ж новую ляльку, якая захоўвала калыску для наступнага дзіцяці.

Лялькі для дзяцей: “Зольная” (рабілі, каб палегчыць праразанне зубоў), “Лялька з зёлкамі” (зашывалі зёлкі з рознымі пахамі, традыцыйная ароматэрапія), “Ліхаманкі” (ставілі ці вешалі каля ложка ці абмотвалі каля трубы печы, іх было ад 7 да 77 штук, лічылася, што любая хвароба, якая прыдзе ў хату, паселіцца ў адну з гэтых лялек і не трапіць да жыхароў. “Ліхаманкі” трымалі роўна год і зпальвалі ў вогнішчы і рабілі новых).

Мужчынскія лялькі: “Крыстец”, лялька рабілася з драўляных прутоў, якія звязваліся чырвонай ніткай крыжом, верхняя частка якога ўпрыгожвалася ніцянымі (ці з паклі) валасамі, а на “рукі” навязваліся рознакаляровыя стужкі, каб злыя духі сцішыліся.


*Мал. 5. “Лялька-падарожніца”*

“Падарожніца” – абярэг для тых, хто знаходзіцца ў дарозе ці на чужыне. Рабілася невялічкай, каб было зручна браць у кішэнь, лялька трымала ў руках платочак, у якім завязваліся зярнятка, каб было што паесці, ніткі, каб путнік заўсёды мог знайсці дарогу дахаты, залу, як сімвал хатняга ачага і родную зямлю, каб давала сілу.

Сёння самаробная лялька-матанка – гэта сімвал нацыянальнай ідэнтыфікацыі, гістарычны артэфакт і, нарэшце, прадмет беларускага народнага побыту і інтэр’еру. Веданне беларускай культуры дапамагае зразумець і адчуць культуру і традыцыі іншых народаў, знайсці агульныя рысы і вызначыць адметныя і непаўторныя. “Дзіця гуляе ў цацкі, гэта для яго сур’ёзная справа, бо праз гульні ён засвойвае веды, знаёміцца з навакольным светам” [5, с. 5]. Вывучэнне лялек-абярэгаў, гісторыі іх ўзнікнення і таямніцы вырабу дапаможа будучым настаўнікам зацікавіць дзяцей і дарослых любога ўзросту, ярка і непаўторна правесці майстар-клас і пазнаць традыцыі свайго народа яшчэ больш глыбока.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Ржавуцкі, М. С. Беларуская гліняная цацка / М. С. Ржавуцкі. – Мінск : Полымя, 1991. – 142 с.
2. Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 5 / рэдкал. : В. В. Калістратава (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2014. – 664 с.
3. Качан, Г. К. Куклы: обереги, обрядовые, игровые. Иллюстрированый мастер-класс / Г. К. Качан. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 88 с.

4. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя. У 2 т. Т.1 : А капэла – Куцця / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2005. – 768 с.
5. Церашковіч, Т. А. Лялька беларуская / Т. А. Церашковіч. – Мінск : Полымя, 1992. – 126 с.